МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ

# ГЕАГРАФІЯ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ

**Праграма курса па выбару для вучняў X класа агульнаадукацыйных устаноў**

**Мінск 2008**

**Аўтар–складальнік:** Шаруха Ігар Мікалаевіч, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, загадчык кафедрай геаграфіі і аховы прыроды Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова

Курс “Геаграфія культуры Беларусі” распрацаваны з мэтай паглыблення разрозненных культурна-геаграфічных і культуралагічных ведаў, якія ўваходзяць у змест сучаснай геаграфіі і іншых школьных прадметаў (гісторыі, біялогіі, літаратуры і інш.). Як адна сістэма ведаў курс раскрывае новыя культуралагічныя і культурна-геаграфічныя паняцці, дае веды па геаграфіі культуры і культурнай спадчыны беларускага народа. Курс садзейнічае міжпрадметнай інтэграцыі і прафарыентацыі школьнікаў.

## Тлумачальная запіска

Асноўная мэта курса «Геаграфія культуры Беларусі» - сінтэзаваць і паглыбіць разрозненыя культуралагічныя і культурна-геаграфічныя веды, што набыты навучэнцамі пры вывучэнні шэрагу школьных прадметаў, у т.л. геаграфіі, гісторыі, біялогіі, літаратуры, музыкі і спеваў, выяўленчага мастацтва, беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры, увязаць іх у адзіную сістэму ведаў.

**Мэта курса** – фарміраванне станоўчага культурна-геаграфічнага вобраза (іміджа) Беларусі, культурна-геаграфічнай карціны краіны.

Галоўнымі **задачамі** з'яўляюцца фарміраванне асноўных паняццяў, такіх як «геаграфія культуры», «геакультурная сітуацыя», «геакультурная прастора», «сацыяльна–эколага–эканамічнае», «гісторыка–культурнае» і «геакультурнае раянаванне», «культурны краявід як аснова устойлівага развіцця»; пазнаёміць з навуковымі асновамі геалінгвістыкі, канфесійнай, этнічнай, электаральнай геаграфіі, з геаграфіяй культурнай спадчыны, геаграфіяй культурных краявідаў, з асновамі і асаблівасцямі беларускай дзяржаўнай (нацыянальнай) ідэалогіі.

**Структура праграмы** складаецца з раздзелаў, тэм 8 практычных работ.

**Формы работы:** міні-лекцыі, калоквіумы, падрыхтоўка і абарона творчых праектаў, вучнёўскія канферэнцыі, прэзентацыі, абмеркаванне літаратурных крыніц, аналіз карт, выпуск тэматычных нумароў сценных карт, правядзене міні-экспедыцый і інш.

Курс мае на ўвазе вывучэнне тэарэтычнага матэрыяла з выкананнем заданняў практычнага і творчага характару і разлічаны на 34 гадзіны.

# З М Е С Т

### Уводзіны

### Раздзел І. Уводзіны ў геаграфію культуры

**Тэма 1. Геаграфія культуры як галіна геаграфіі**. Геаграфія – найстаражытнейшая навука. Пачатковыя звесткі з галіны культурнай геаграфіі ў працах старажытных вучоных. Культуралагічны патэнцыял геаграфіі. Культура і геаграфія. Паняцце «геаграфія культуры». Геаграфія культуры як абноўлены накірунак у геаграфіі. Што вывучае геаграфія культуры. Месца ў сістэме геаграфічных навук. Крыніцы ведаў.

Структура геаграфіі культуры. Асноўныя паняцці. Метады даследаванняў. Выкарыстанне метада гісторыка-геаграфічнага аналіза, мастацкага метада ў даследаваннях.

### Раздзел 2. Геакультурныя асаблівасці насельніцтва Беларусі.

**Тэма 2. Гісторыка–геаграфічныя асаблівасці засялення і асваення тэрыторыі Беларусі.** Гісторыка–геаграфічныя асаблівасці засялення і асваення тэрыторыі Беларусі. Старажытнае насельніцтва Беларусі – пра - беларусы. Засяленне тэрыторыі Беларусі фіна-вугорскімі, старажытнымі індаеўрапейскіміі плямёнамі. Асваенне тэрыторыі Беларусі славянамі.

**Тэма 3**. **Беларусы – еўрапейская нацыя.** Беларусы – еўрапейская нацыя. Беларусы ў сусветнай супольнасці. Этна–гістарычныя працэсы. Беларусы як нацыя. Беларусы вачыма суседзяў. Беларусь – радзіма выдатных вучоных, мастакоў, музыкантаў, спартсменаў.

Беларусы як народнасць. Беларускія дыяспары Еўропы, Азіі, Амерыкі, Аўстраліі. Уклад беларусаў у развіццё навукі, культуры. Антрапалагічныя асаблівасці насельніцтва Беларусі. Уплыў эколага–прыродных і сацыяльна–эканамічных умоў на характар і культурныя асаблівасці беларусаў.

**Тэма 4. Геакультурныя асаблівасці насельніцтва Беларусі.** Агульная характарыстыка. Асаблівасць сучаснай дэмаграфічнай сітуацыі на Беларусі. Канфесійная геаграфія Беларусі. Асаблівасці хрысціянства, іудаізму, ісламу і буддызму. Нецаркоўная рэлігійнасць. Перажыткі паганскіх вераванняў. Секулярызацыя грамадскага жыцця. Уплыў рэлігійнай культуры (літаратура, архітэктура, эстэтыка і інш.) на грамадска-культурнае жыццё.

Этнакультурныя асаблівасці насельніцтва. Нацыянальны склад. Нацыянальныя меншасці Беларусі. Гісторыя засялення імі тэрыторыі Беларусі, геаграфічныя асаблівасці рассялення. Уплыў на культуру Беларусі народаў, якія яе насяляюць. Характар узаемаадносін і ўзаемадачыненняў з тытульнай нацыяй. Геаграфія этнічных дыяспар.

Этнаграфічныя і лінгвістычныя асаблівасці насельніцтва Беларусі. Абрады. Традыцыі. Святы. Культура харчавання. Беларуская і нацыянальныя кухні. Асаблівасці медыцынскай культуры розных этнічных суполак.

Сучасная геакультурная сітуацыя. Асаблівасці беларускай дзяржаўнай (нацыянальнай) ідэалогіі.

Асаблівасці рассялення насельніцтва. Асаблівасці гарадскога і сельскага рассялення.

Гарады – цэнтры культуры. Гарадскі асяродак – асобы культурны асяродак.

Геаграфія гарадской культуры. Геаграфія культурнай інфраструктуры. Культура буйных і малых гарадоў Беларусі.

Геакультурныя асаблівасці гарадоў і гарадскіх краявідаў Паўночнай, Цэнтральнай, Паўднёвай Беларусі. Вобразы гарадоў.

**Практычныя работы**:

1. Нанесці на контурную карту межы рассялення балцкіх, фіна-вугорскіх, славянскіх плямёнаў.

2. Нанесці на контурную карту найстаражытныя гарады Беларусі (з паказам часу заснавання /першага успаміну)*[1].

3. Беларусь – краіна выбітных вучоных, мастакоў, музыкантаў, спартсменаў (напісанне і абмеркаванне рэфератаў).

4. На контурнай карце свету падпісаць дзяржавы, на тэрыторыі якіх зафіксаваны беларускія дыяспары*.

**Раздзел 3. Асаблівасці культурнага асваення тэрыторыі**

**Тэма 5**. **Культурна-геаграфічныя асаблівасці этнічнага прыродакарыстання.** Асаблівасці развіцця гаспадаркі. Нацыянальныя асаблівасці развіцця сельскай гаспадаркі і рамёстваў. Асаблівасці развіцця гандлю і індустрыі. Гаспадарчая культура. Культурна-гаспадарчыя тыпы.

**Тэма 6. Эколагакультурная геаграфія. Геаграфія культурных краявідаў. Тапонімы як элемент культурнага краявіда.** Асаблівасці прыроды Беларусі. Уплыў прыроды на развіццё гаспадаркі, рассяленне насельніцтваі. Уплыў чалавека на прыроду. Эколага–геаграфічнае раянаванне. Эколага–культурная геаграфія.

Краявід. Эстэтыка краявідаў. Культурны краявід. Вывучэнне культурных краявідаў. Вобразы месца. Культурны краявід як аснова устойлівага развіцця.

Культурны краявід горада. Эстэтыка гарадскога краявіда. Гарадская геральдыка як вобраз месца.

---

[1] Практические работы под звездочкой (*) носят обязательный для выполнения характер.

Тапаніміка Беларусі як люстэрка культурна–гістарычных і геаграфічных працэсаў. Тапонімы як элемент культурнага краявіда. Тапонімы – культурны здабытак народа. Рэгіянальныя асаблівасці геатапаніміі. Геалінгвістыка. Лінгвістычная геаграфія.

**Практычныя работы:**

5. Эколага–геаграфічнае раянаванне. Нанясенне на контурную карту межаў эколага–геаграфічных раёнаў.

6. Тапаніміка Беларусі. Правядзенне класіфікацый назваў геаграфічных аб'ектаў. Тлумачэнне назваў рэк, азёр, лясных масіваў, населеных пунктаў (па выбару)*.

## Раздзел 4. Рэгіянальная геаграфія культуры

**Тэма 7. Культурнае раянаванне.** Гісторыка-культурнае і геакультурнае краявідазнаўства. Гісторыка–культурнае раянаванне XIX–пач. XX стст. (па В.Цітову). Паазер'е. Панямонне. Цэнтральная Беларусь. Падняпроўе. Заходняе Палессе. Усходняе Палессе. Прыродна–гаспадарчае і гісторыка–культурнае раянаванне ў «Географіі Беларусі» А.Смоліча. Мастацкія вобразы тэрыторыі.

Праблемы правядзення гісторыка–культурнага і культурна–краявіднага раянавання Беларусі. Рэгіянальная культурная географія.

**Тэма 8. Культурная спадчына як элемент культурнага краявіда.** Геаграфія культурнай спадчыны. Культурная спадчына Беларусі. Геаграфія культурнай спадчыны. Культурная спадчына рэгіёнаў.

**Тэма 9. Геаграфія ладу жыцця.** Складаючыя ладу жыцця. Аналіз чыннікаў, што дэтэрмінуюць лад жыцця. Геаграфія ладу жыцця.

**Тэма 10. Палітычная культура.** Палітычная культура. Уплыў партый, рухаў, грамадскіх арганізацый на грамадска–палітычнае і культурнае жыццё.

**Практычныя работы:**

7 Параўнанне гісторыка–культурнага раянавання (па В.Цітову) з прыродна – гаспадарчым і гісторыка–культурным раянаваннем у «Географіі Беларусі» А.Смоліча*.

8. Культурная спадчына Беларусі. Выявіць на тэрыторыі сваёй вобласці аб'екты, якія можна аднесці да аб'ектаў культурнай спадчыны*.

## ЧАКАЕМЫЯ ВЫНІКІ:

**У выніку вывучэння курса у навучэнцаў будуць сфарміраваны ўяўленні аб** гісторыка–геаграфічных асаблівасцях і ўмовах засялення і асваення тэрыторыі Беларусі, асаблівасцях этна–гістарычных працэсаў; выдатных ураджэнцах; дыяспарах; укладзе беларусаў у развіццё навукі, культуры; антрапалагічных і геакультурных асаблівасцях насельніцтва, рэлігійным складзе, асаблівасцях канфесій і іх уплыве на грамадскае жыццё; этнаграфічных і лінгвістычных асаблівасцях насельніцтва; сучаснай геакультурнай сітуацыі, асаблівасцях дзяржаўнай ідэалогіі; аб геакультурных асаблівасцях гарадоў і гарадскіх краявідаў, нацыянальных асаблівасцях гаспадаркі, гаспадарча-культурнай геаграфіі; асновах гісторыка гісторыка-культурнага і культурнага краявідазнаўства; падыходах да гісторыка–культурнага і культурна–краявіднага раянавання; аб элементах рэгіянальнай культурнай геаграфіі; аб элементах культурнай спадчыны; чынніках ладу жыцця; асновах палітычнай культуры.

**Навучэнцы павінны авалодаць наступнымі спосабамі дзейнасці**: характарызаваць і паказываць па карце распаўсюджанне дыяспар; выяўляць асаблівасці рассялення насельніцтва; характарызаваць этнаграфічныя і лінгвістычныя асаблівасці насельніцтва; характарызаваць сучасны геакультурны стан; складаць візітоўкі-вобразы гарадоў; называць

асаблівасці развіцця гаспадаркі, асаблівасці прыроды, рассялення; выяўляць асаблівасці нацыянальнага прыродакарыстання; карыстацца тапанімічнымі слоўнікамі для «расшыфроўкі» геаграфічных назваў; выяўляць і паказываць па карце сучасныя гісторыка–культурныя і культурна–краявідныя раёны; характарызоваць аб'екты культурнай спадчыны; выяўляць элементы культурнай спадчыны рэгіёнаў.

**Вывучэнне дадзенага курса мяркуе** павышэнне цікавасці да культурнай геаграфіі, геаграфіі ўвогуле, праз выкананне практычных задач і прымяненне атрыманых ведаў у рэальнам жыцці; развіццё геаграфічнай культуры, агульнай культуры навучэнцаў; развіццё пазнавальных схільнасцей і здольнасцей вучняў; фарміраванне вопыта творчай і даследчай дзейнасці.

**Літаратура:**

Атлас «Беларусы»: Этнаграфія. Дэмаграфія. Дыяспара. Канфесіі /Пад рэд. С.А. Польскага. – Мн., 1996.
Веденин Ю.А. Культурно-ландшафтное районирование России – ориентир культурной политики //Ориентиры культурной политики. - М., 1997. - № 2.
Веденин Ю.А. Проблемы формирования культурного ландшафта и его изучения //Изв.АН СССР. Сер. Географич. 1990.- № 1.
Гардзіенка Н. Беларусы ў Аўстраліі: Да гісторыі дыяспары. –Мн.: Бел.кнігазбор, 2004.
География культуры. –М: Институт наследия, 2001.
Иванов К.П. Проблемы этнической географии. –Спб., 1998.
Калуцков В.Н. Этнокультурное ландшафтоведение и концепция культурного ландшафта //Культурный ландшафт: вопросы теории и методологические исследование. – М.-Смоленск: Изд-во СГУ, 1998.
Кіпель В. Беларусы ў ЗША. –Мн., 1993.
Культурная география /Под ред. Ю.А. Веденина, Р.Ф. Туровского. –М., 2001.
Культурная география: теория, методология, региональный синтез. –Иркутск, 2004.
Культурный ландшафт как объект наследия /Научн.ред. Ю.А. Веденин, М.Е. Кулешова. –М.-Спб., 2004.
Культурный ландшафт: теоретические и региональные исследования. –М.: МГУ, 2003
Локотко А.И. Белорусское народное зодчество. –Мн., 1991.
Манаков А.Г. Геокультурное пространство Северо-Запада Русской равнины: динамика, структура, иерархия. – Псков, 2002.
Манаков А.Г. Основы культурно-географической регионалистики. –Псков, 2006.
Микулич А.И. Геногеография сельского населения Беларуси. –Мн., 1989.
Проблемы этнической географии и культурного районирования /Под ред.А.Г.Манакова. – Псков, 2004.
Рагулина М.В. Культурная география. /ИГ РАН. –М.: ИГ РАН, 2004.
Родоман Б.Б. Саморазвитие культурного ландшафта и геобионические закономерности его формирования /Географические науки и районная планировка. – М., 1980.
Романюк М.Ф. Беларускае народнае аддзенне. –Мн., 1984.
Сачанка Б.І. Беларуская імігрconsiderацыя. –Мн., 1991.
Сергачев С.А. Белорусское народное зодчество. –Мн., 1992.
Смоліч А. Геаграфія Беларусі /Паслясл. А.Ліса. –4 выд. -Менск, 1993.
Титов В.С. Историко-этнографическое районирование материалов культуры белорусов. – Мн., 1983.
Трацевский В.В. История архитектуры народного жилища Белоруссии. – Мн., 1989.
Туровский Р.Ф. Культурная география: теоретические основания и пути развития /Культурная география. – М., 2001.
Туровский Р.Ф. Культурный ландшафт России. –М., 1998.

Шарухо И.Н. Культурно-географическое районирование Беларуси //Рэгіянальная геаграфія: Праблемы развіцця і выкладання: Зб. навук.артыкулаў – Магілёў, 2004.
Шарухо И.Н. Опыт проведения культурно-географического районирования Беларуси //Районирование в современной экономической, социальной и политической географии: потенциал, теория, методы, практика. /Под ред. А.Г.Дружинина, В.Е.Шувалова. –Ростов–на-Дону, 2004.
Шарухо И.Н. Устойчивость границ культурно–географических регионов Беларуси. – В кн.: Российско–Белорусское порубежье: устойчивость социально–культурных и эколого–хозяйственных систем /Под ред. А.Г.Манакова. – Псков, 2005.
Шарухо И.Н. Проблемы запустения и расширения периферии как культурно-географическая проблема //Запад России и ближнее зарубежье: устойчивость социально-культурных и эколого-хозяйственных систем. –Псков, 2005.
Ширяев Е.Е. Беларусь: Русь Белая, Русь Чёрная и Литва в картах. –Мн., 1991.
Этнаграфія Беларусі: Энц.даведнік. – Мн., 1989.